# Маладзечна — культурная сталіца Беларусі 2016 года

*К. Д. Варанько,*
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**2016 год аб'яўлены ў нашай краіне Годам культуры, а Маладзечна, лёс якога цесна звязаны з імёнамі славутых людзей, што ўнеслі ўклад не толькі ў нацыянальную, але і ў сусветную гісторыю і культуру, атрымала статус культурнай сталіцы Беларусі.**

Горад Маладзечна ўжо даўно і па праве называюць цэнтрам культурнага жыцця Мінскай вобласці. На маладзечанскай зямлі ўзышла зорка вялікага Янкі Купалы. Тут нарадзіліся навукоўцы-натуралісты браты Бенядзікт і Уладзіслаў Дыбоўскія. У Маладзечанскай павятовай школе вучыўся паэт і стваральнік першага ў Расіі мінералагічнага музея Тамаш Зан. З гэтым краем звязана дзейнасць такіх знакамітых дзеячаў нацыянальнай культуры, як Сымон Будны, Міхал Клеафас Агінскі, Максім Багдановіч, Ядвігін Ш., Браніслаў Тарашкевіч. У Маладзечне жылі і працавалі гісторык Мікола Ермаловіч, паэт і перакладчык Пятро Бітэль, празаік Мікола Капыловіч. З гэтымі мясцінамі звязаны жыццёвы і творчы шлях краязнаўца і літаратуразнаўца Генадзя Каханоўскага. Маладзечанская зямля атрымала вядомасць дзякуючы дзейнасці сучасных музыкантаў і выканаўцаў Іосіфа Сушко, Рыгора Сарокі, Алега Елісеенкава, Юрыя Антонава, паэта Кастуся Цыбульскага, вучонага ў галіне анкалогіі Леаніда Путырскага і іншых знакамітых асоб.

Гэты год, несумненна, стане плённым і багатым на правядзенне ўнікальных і арыгінальных мерапрыемстваў, інавацыйных праектаў у Маладзечне. Знакавай падзеяй у культурным жыцці горада з'явіцца цыкл мерапрыемстваў «Майстры мастацтваў — культурнай сталіцы Маладзечна». Рэалізацыя дадзенага праекта запланавана на ўвесь год. У яго праграме — канцэртныя выступленні вядучых творчых калектываў і выканаўцаў, мастацкія выстаўкі, спектаклі, сустрэчы са знакамітымі майстрамі мастацтваў Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа. Праект таксама будзе садзейнічаць захаванню і ўмацаванню творчых сувязей з гарадамі і раёнамі-пабрацімамі Маладзечна.



**Герб горада Маладзечна**

Сёлета адбудзецца і XVI Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна», які ўжо добра вядомы ў рэспубліцы. Гэта свята адкрывае новыя імёны і дае магчымасць пазнаёміцца з творчасцю беларускіх кампазітараў і паэтаў, апынуцца ў чароўным свеце вершаваных радкоў і мелодый роднага краю. Праграма фестывалю будзе прымеркавана да 75-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі і СССР Уладзіміра Мулявіна. Удзельнікамі мерапрыемства стануць заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь сімфанічны аркестр Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага і Маладзечанскі маладзёжны музычны народны тэатр. Незабыўныя ўражанні чакаюць аматараў класічнай, джазавай, сучаснай музыкі. Міжнародны творчы праект «Маладзечанцы — роднаму гораду», які запланаваны на гэты год, падорыць гараджанам і гасцям Маладзечна сустрэчы з былымі выпускнікамі музычнага каледжа. У межах гэтага форуму пройдуць і творчыя вечары вядомых землякоў. Для моладзі плануецца правядзенне конкурсаў «Міс Маладзечна — 2016», цырульніцкага мастацтва «Свет прыгажосці», фестывалю творчай моладзі «ART-HOUSE», які аб'ядноўвае таленавітых прадстаўнікоў сучасных альтэрнатыўных



**Від на вуліцу Вялікі Гасцінец і парк Перамогі г. Маладзечна**

мастацкіх напрамкаў. Упершыню ў горадзе пройдзе творчы конкурс «Сімвал маладога пакалення», адбудзецца ўручэнне штогадовай маладзёжнай прэміі «Рэспект года», адкрыецца фестываль пясочнай анімацыі «SandArt». Для прадстаўнікоў старэйшага пакалення запланаваны фестываль «Звіні, наша песня, пераможным салютам», свята «Восеньскі настрой», конкурс «Мы шукаем таленты».

Сёння Маладзечна займае годнае месца сярод гарадоў Беларусі. Пазнаёміцца з гісторыяй і культурным жыццём сучаснага горада, дзейнасцю яго ўстаноў культуры, якія выконваюць важную місію па стварэнні неабходных умоў для развіцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу маладзечанцаў, далучэнні іх да ўнікальных культурных і гістарычных традыцый, дапаможа бібліяграфічны спіс «Маладзечна — культурная сталіца Беларусі 2016 года» (складальнік — Н. А. Шашэнька), апублікаваны ў бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2016, № 3), які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

Спіс складаецца з наступных раздзелаў: «Маладзечна — горад старажытны і сучасны», «Адукацыя ў Маладзечне», «Культурнае жыццё горада». Усе раздзелы суправаджаюцца невялікімі нарысамі. Некаторыя бібліяграфічныя апісанні крыніц дапоўнены анатацыямі, што дазваляе лёгка арыентавацца ў прапанаванай інфармацыі.

Бібліяграфічны спіс разлічаны на бібліятэчных работнікаў, выкладчыкаў, настаўнікаў, студэнтаў, экскурсаводаў, а таксама будзе карысны ўсім, хто цікавіцца гісторыяй самабытных беларускіх гарадоў. У яго ўключаны дакументы, выдадзеныя пераважна за апошнія дзесяць гадоў.